ЗАЦВЕРДЖАНА
Пратаколам Савета
аддзела культуры
Пінскага райвыканкама
29.09.2022 № 9

Аб правядзенні сярод бібліятэк
дзяржаўнай установы культуры
"Пінская раённая цэнтралізаванная
бібліяіэчная сістэма" раённага
агляду-конкурсу на лепшую
тэатралізацыю твораў Я.Коласа
"Якуба слова - дзіўны дар"

З мэтай азнаменавання 140-годдзя з дня нараджэння Якуба Коласа, папулярызацыі творчай спадчыны пісьменніка, прывіцця любові да роднай мовы, павышэння цікавасці да чытання, выхавання патрыятычнага пачуцця гонару і любові да роднага краю, развіцця творчай актыўнасці чытачоў бібліятэк, Савет аддзела культуры ПАСТАНАЎЛЯЕ:

1. Раённы агляд-конкурс на лепшую тэатралізацыю твораў Я.Коласа "Якуба слова - дзіўны дар" правесці з 10 па 23 кастрычніка 2022 года.

2. Зацвердзіць палажэнне аб конкурсе, склад журы (Дадатак 1,2).

3. Аддзелу бібліятэчнага маркетынгу ЦРБ імя Я.Янішчыц забяспечыць удзел усіх бібліятэк ДзУК "Пінская раённая цэнтралізаванная бібліятэчная сістэма" у раённым аглядзе-конкурсе на лепшую тэатралізацыю твораў Я. Коласа "Якуба слова - дзіўны дар".

4. Кантроль за правядзеннем конкурса ўскласці на дырэктара дзяржаўнай установы культуры «Пінская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма» В.М.Антанчук.

ДАДАТАК №1
да Пратакола Савета
аддзела культуры
Пінскага райвыканкама
29.09.2022 № 9

**ПАЛАЖЭННЕ**
аб правядзенні раённага агляду-конкурсу
на лепшую тэатралізацыю твораў Я.Коласа
“Якуба слова - дзіўны дар”

## 1. Асноўныя мэты і задачы інтэрнэт-конкурса:

1.1. Азнаменаванне 140-годдзя з дня нараджэння Якуба Коласа.
1.2. Актывізацыя дзейнасці бібліятэк па папулярызацыі твораў Якуба Коласа.
1.3. Адраджэнне цікавасці карыстальнікаў бібліятэк да твораў Якуба Коласа праз развіццё фантазіі і творчых здольнасцей бібліятэкараў.

## 2. Парадак і ўмовы правядзення інтэрнэт-конкурса:

2.1. Тэрмін правядзення конкурса: з 10 па 23 кастрычніка 2022 года.
2.2. Удзельнікамі конкурса з’яўляюцца ўсе бібліятэкі ДзУК “Пінская раённая цэнтралізаванная бібліятэчная сістэма”.
2.3. Умовы конкурса:

- відэазапіс чытання паэтычнага твора на памяць;
- выкарыстанне пры прадстаўленні паэтычнага твора элементаў тэатралізацыі;
- конкурсныя матэрыялы дасылаць у аддзел бібліятэчнага маркетынгу ЦРБ імя Я.Янішчыц да 23 кастрычніка 2022г. на электронную пошту prcbs@kultrik.by .

## 3. Крытэрыі адзнакі:

3.1. Адпаведнасць тэматыцы конкурса.
3.2. Выразнасць і правільнасць мовы.
3.3. Выкананне вершаў на беларускай мове.
3.4.Творчы падыход з элементамі тэатралізацыі да выканання паэтычных твораў.

3.5. Кожны відэафайл павінен утрымліваць толькі адзін канкурсны нумар.
3.6. Прымаюцца відэазапісы жывога выканання.
3.7. Фармат відэароліка MOV, MP4, AVI.

## 4. Падвядзенне вынікаў

4.1. Пераможцы (1,2,3 месца) ў раённым аглядзе-конкурсе вызначаюцца журы, ўзнагароджваюцца Дыпломамі аддзела культуры Пінскага райвыканкама і сувенірамі.
4.2. Інфармацыя аб правядзенні конкурса, а таксама яго выніках публікуецца ў інфармацыйна-рэкламным бюлетэні «Кругозор», адлюстроўваецца на афіцыйным сайце і сацыяльных сетках цэнтральнай раённай бібліятэкі імя Я.Янішчыц, а таксама у сацыяльных сетках аддзела культуры Пінскага райвыканкама.

ДАДАТАК №1
да Пратакола Савета
аддзела культуры
Пінскага райвыканкама
29.09.2022 № 9

**СКЛАД ЖУРЫ**
па правядзенню раённага
агляду-конкурсу на лепшую тэатралізацыю твораў Я. Коласа
"Якуба слова - дзіўны дар"

1. Міхалевіч К.Л. – галоўны спецыяліст аддзела культуры Пінскага райвыканкама;
2. Антанчук В.М. – дырэктар дзяржаўнай установы культуры «Пінская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма»;
3. Шэляговіч К.Я. – загадчык аддзела бібліятэчнага маркетынгу ЦРБ імя Яўгеніі Янішчыц;
4. Паўлюкавец Н.У. – галоўны бібліятэкар аддзела бібліятэчнага маркетынгу ЦРБ імя Яўгеніі Янішчыц;
5. Бурба Н.І. – метадыст аддзела бібліятэчнага маркетынгу ЦРБ імя Яўгеніі Янішчыц.